ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік галоўнага ўпраўлення
па адукацыі
Магілёўскага аблвыканкама
_____________ А.Б.Заблоцкі
"__" кастрычніка 2024 г.

# ЗАДАННІ
## для правядзення рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура"

## КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА З ЭЛЕМЕНТАМІ ВОДГУКУ

Дата правядзення: 19 кастрычніка 2024 г.
Час выканання заданняў: 10.00 – 14.00.

**X клас**

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | 9 | 10 | 4 | 10 | 12 | 17 | 10 | 6 | 2 | 20 | 100 |

**Заданне 1.** Раскрыйце дужкі і запішыце правільныя формы назоўнікаў.

*Максімальная колькасць балаў – 9.*

| | | |
|---|---|---|
| Іграць на (раяль) | перамог у (сутычка) | цвіценне (рапс) |
| не было (адказ) | з генералам (Марэсьеў) | аб вядомым (цясляр) |
| на вуліцах (горад) | пераможцы (конкурс) | хадзіць па (зямля) |

**Заданне 2.** У беларускай мове ёсць шмат слоў, якія ў параўнанні з рускай мовай абазначаюць паняцці больш дакладна. Падбярыце да наступных рускіх словазлучэнняў беларускія адпаведнікі.

*Максімальная колькасць балаў – 10.*

| Рускія словы і словазлучэнні | Пераклад на беларускую мову |
|---|---|
| гнездо аиста | |
| сарай для телег | |
| резиновые сапоги | |
| окончание уборки хлеба | |
| собирать милостыню, просить подаяния | |
| расти пышно, буйно, густо | |
| женщина весёлого характера | |
| карманный складной ножик | |
| непаханая земля, густо поросшая травой | |
| лягушечья икра | |

**Заданне 3.** У нашай краіне ёсць цудоўная традыцыя: у першыя выхадныя дні верасня адзначаецца Дзень беларускага пісьменства. Цэнтрам свята становіцца невялікі горад, значны ў культурных адносінах. Там ладзяцца кніжныя выставы, конкурсы, сустрэчы пісьменнікаў з чытачамі і многія іншыя мерапрыемствы, якія наведваюць госці. У якім горадзе ўпершыню адзначаўся Дзень беларускага пісьменства ў 1994 годзе? ____________________ У якім горадзе прайшло свята сёлета? ________________________________. Назавіце фанетычныя асаблівасці беларускай мовы, якія ёсць у гэтых дзвюх назвах гарадоў.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

| Назва горада, дзе адзначаўся Дзень беларускага пісьменства | Фанетычная асаблівасць беларускай мовы ў назве горада |
|---|---|
| 1994 год | |
| 2024 год | |

**Заданне 4.** Раздзяліце наступныя словы на марфемы, размясціўшы іх у асобных ячэйках табліцы.

*Максімальная колькасць балаў – 10.*

| Слова | Прыстаўка | Корань | Суфікс (ы) | Канчатак | Постфікс |
|---|---|---|---|---|---|
| **Узор:** *перацягванне* | *пера-* | *-цяг-* | *-ва- -нн-* | *-е* | - |
| гаваркі | | | | | |
| завочніца | | | | | |
| зацікавяцца | | | | | |
| агледзецца | | | | | |
| навучальны | | | | | |
| прыпол | | | | | |
| зайчаня | | | | | |
| жыццёвасць | | | | | |
| мулярства | | | | | |
| раптоўна | | | | | |

**Заданне 5.** Замяніце наступныя фразеалагізмы адным словам і ўкажыце, з якой часцінай мовы суадносіцца кожны з іх.

*Максімальная колькасць балаў – 12.*

| Фразеалагізм | Слова, якое тлумачыць значэнне фразеалагізма | Часціна мовы, з якой суадносіцца фразеалагізм |
|---|---|---|
| краевугольны камень | | |
| садом і гамора | | |
| рваць на сабе валасы | | |
| жабе па калена | | |
| з макавае зярнятка | | |
| Хоць вока выкалі | | |

**Заданне 6.** Пастаўце націскі ў наступных словах.

*Максімальная колькасць балаў – 17.*

Слабы, малы, дзеяч, жальба, першынец, кашляць, трызненне, ялавічына, аб'інець, туманы, наспех, загнуты, нажніцы, пасланец, бульбяны, металургія, нікуды.

**Заданне 7.** Перакладзіце наступны тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – 10.*

Прошедшие века щедрой рукой рассеивали по нашей земле архитектурные памятники, и эти же века беспощадно рушили их бесконечным лихолетьем. Но и то, что уцелело, не может оставить равнодушным, ибо создано на этой земле усилиями её сыновей: именитых просветителей и священников, простых мужиков и талантливых зодчих – создано народом.

И сегодня, независимо от собственных вероисповедания и мировоззрения, мы обязаны сделать всё возможное, чтобы сберечь для себя и потомков наш общий храм – память о прошедшем.

**Заданне 8.** Як вядома, існуе некалькі родаў мастацкай літаратуры. Размяркуйце наступныя творы па калонках табліцы ў адпаведнасці з прыналежнасцю іх да пэўнага роду.

Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч "Пінская шляхта", Францішак Багушэвіч "Кепска будзе!", Аркадзь Куляшоў "Мая Бесядзь", Янка Купала "Магіла льва", Уладзімір Караткевіч "Дзікае паляванне караля Стаха", Васіль Быкаў "Жураўліны крык".

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| Эпас | Лірыка | Драма | Ліра-эпас |
|---|---|---|---|
| | | | |
| | | | |

**Заданне 9**. Пра каго апавядаецца ў наступным урыўку з агіяграфіі?

*Максімальная колькасць балаў – 2.*

*"Была яна дапамогай пакрыўджаным, суцяшэннем смуткуючым, распранутым – адзеннем, хворым – наведаннем ці, проста кажучы, – для ўсіх была ўсім".*

**Заданне 10**. Напішыце міні-водгук (да 15 сказаў, 3 абзацы) на наступны паэтычны твор.

Дала мне маці гэту мову,
Каб не нямым прыйшоў у свет,
Дала мне маці гэту мову,
Як спадчыну і запавет.

Была яна не беларучкай
І на жніве, і на сяўбе;
На глебе добрай беларускай
Здабыты словы ўсе яе.

Прапахлі сонцам і падзолам,
Дажджамі, сокамі раслін,
Пад знак рукам яе мазольным,
Што мелі толькі ў сне спачын.

Дачка мая! У жыццёвай прозе
У буднях і святочным днём
Не пакідай яе ў парозе,
Калі ў нечы ўвойдзеш дом.

*Аляксей Пысін*, 1980 год*

***Даведка**. Аляксей Пысін (1920-1981) – пісьменнік-франтавік з Магілёўшчыны.*

*Максімальная колькасць балаў – 20.*